УДК 94(41/99)

# РОЛЯ БЕЛАРУСКАГА СЯЛЯНСТВА Ў ПАЎСТАННІ 1863–1864 гг.

**Багдановіч А. І.**
установа адукацыі
"Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт"
(Мінск, Рэспубліка Беларусь)

Анатацыя. Артыкул прысвечаны ролі беларускага сялянства ў паўстанні 1863–1864 гг. на тэрыторыі паўночна-заходніх губерняў Расійскай імперыі. Невялікая частка сялян прыняла ўдзел у паўстанні, многія засталіся ў баку. Але было шмат і тых, хто прыняў удзел у падаўленні паўстання. Удзел сялян у баявых дзеяннях і ў іншых відах перасследу паўстанцаў дазволіў імперскім уладам хутка і адносна лёгка атрымаць перамогу.

Ключавыя словы: паўстанне, сяляне, шляхта, памешчыкі, падаўленне, варта, супярэчнасці.

Summary: The article is devoted to the role of the peasantry in the uprising of 1863–1864 on the territory of the North-Western provinces of the Russian Empire. A small part of the peasants took part in the uprising, many were left on the sidelines. But there were many who took part in suppressing of the uprising. The participation of peasants in hostilities and in other forms of persecution of the rebels allowed the imperial authorities to win quickly and relatively easily.

Keywords: uprising, peasants, gentry, landowners, suppression, guards, contradictions.

Паўстанне 1863 – 1864 гг. добра вывучана, існуе шэраг прац, якія, так ці інакш, закранаюць гэтае пытанне. Сярод найбольш цікавых даследаванняў такога тыпу можна назваць працы В. Ф. Ратча [5], В. М. Ігнатоўскага [2], І. М. Лушчыцкага [3]. У іх змяшчаюцца звесткі пра найважнейшых палажэнні праграмы Канстанціна Каліноўскага, якая змяшчала пункты аб знішчэнні дваранства, ліквідацыі памешчыцкага землеўладання шляхам сялянскай рэвалюцыі.

Аднак існуюць навуковыя працы, якія сведчаць пра вельмі неадназначную ролю сялян у паўстанні. Напрыклад, на думку М. В. Біча, сяляне ў асноўнай сваёй масе не падтрымалі паўстанне, а ў многіх частках Беларусі прынялі актыўны ўдзел у яго падаўленні [1]. На гэта ж указвае і цэлы шэраг архіўных крыніц, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Абапіраючыся на іх, аўтар робіць выснову аб тым, што царская ўлада ў асобе генерал-губернатара М. М. Мураўёва ўмела выкарыстоўвала класавыя супярэчнасці паміж сялянамі і шляхтай, якая спачувала паўстанню такім чынам, што сяляне ў большасці сваёй сталі на бок задушэння паўстання.

Генерал ад інфантэрыі М. М. Мураўёў дамогся значнага паслаблення "палажэнняў" 1861 г. За кошт зніжэння выкупных плацяжоў 1861 г. на 20%, было ліквідавана часова абавязанае становішча сялян і ўведзены абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў. Гэтак жа ім вярталіся "адрэзкі", беззямельныя сяляне надзяляліся трыма дзесяцінамі зямлі. Акрамя таго, ім перадавалася зямля, канфіскаваная ва ўдзельнікаў паўстання. Узамен генерал-губернатар абавязаў "сельскія таварыствы" сфарміраваць спецыяльныя сельскія варты, якія павінны былі весці барацьбу з паўстанцамі [1, с. 242].

Пра гэта кажуць распаўсюджаныя 24 красавіка 1863 г. па паветах "Найвысока зацверджаныя" правілы па стварэнні ваенных вартаў, сялян, якія пачалі фарміравацца ўжо ў маі 1863 г. Каравулам была прадстаўлена агнястрэльная зброя, боепрыпасы і казённы правіянт [12, арк. 3].

Прызначэнне сельскіх варт было акрэслена ваенным начальнікам Віцебскага павета падпалкоўнікам Корсакавым наступным чынам: клапаціцца аб прадухіленні спроб мяцяжу; назіраць за тымі, хто праходзіць і праязджае праз кантралюемую тэрыторыю; сачыць, каб не прапускаліся падазроныя асобы; ахоўваць ад гвалту мясцовае насельніцтва з боку бунтаўшчыкоў [10, арк. 1–3].

Улады мелі неабходнасць у сельскіх каравулах таму, што ў тагачаснай паліцыі не хапала людзей, бо толькі ў 1862 г. яна набыла рысы пастаяннай дзяржаўнай службы дзякуючы «Часовым правілам па ўладкаванні паліцыі». Але згодна з імі ў гарадах з насельніцтвам не больш за 2 тысячы чалавек павінна было прыходзіцца не больш за пяць гарадавых. У буйнейшых гарадах – не больш за аднаго гарадавога на 5 тысяч жыхароў [4, с. 210].



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Такая больш чым сціплая колькасць асабістага складу прымушала звяртацца за дапамогай да сялян. Пры гэтым тыя, хто прымалі рашэнне аб перадачы зброі сельскім каравулам, былі ўпэўненыя ў іх надзейнасці. Такая ступень даверу сялянам засноўвалася на веданні рэальнай сітуацыі ў грамадстве. Мураўёў, разлічваў на тое, што сяляне захочуць адпомсціць абшарнікам за векавыя крыўды, і гэты разлік аказаўся дакладным.

Вось што пісаў сенненскі павятовы маршалак дваранства Ю. С. Рашкоўскі ў сваім прашэнні магілёўскаму грамадзянскаму губернатару А. П. Беклемішаву: “У павеце лютуе поўны сялянскі тэрор. Натоўпы сялян канчаткова прысвоілі сабе ўсе атрыбуты грамадскай улады: яны арыштоўваюць, робяцьператрусы па хатах, вызваляюць арыштаваных і дастаўляюць іншых арыштаваных мясцовым уладам, калі ім уздумаецца, затрымліваюць без разбору ўсіх, хто праязджае па дарогах, абшукваюць і, не знайшоўшы нічога падазронага, дастаўляюць іх у г. Сянно пад вартай, а часам звязанымі жорстка. Многія жыхары тутэйшага павета, з прычыны адсутнасці асабістай бяспекі, параязджаюць, кідаючы сваю гаспадарку, на жыхарства ў бліжэйшыя гарады, іншыя ж просяць у мясцовых улад у г. Сянно пасведчанняў на свабодны праезд па павеце або існаванне ў сваіх маёнтках. Апошняя мера, зрэшты, не мае роўна ніякага дзеяння, таму што сяляне зусім не звяртаюць увагі на выдадзеныя паліцэйскай уладай сведчанні і, затрымаўшы на дарозе асоб, забяспечаных такімі сведчаннямі, дастаўляюць назад пад вартай у г. Сянно. Ваша правасхадзіцельства, дваране павета просяць засцерагчы іх ад свавольных дзеянняў сялян самымі сапраўднымі мерамі” [9, арк. 65–66].

Але прадстаўнікі ўладаў не толькі не дапамаглі дваранам Сенненскага павета, але і самога Юліяна Серафімавіча Рашкоўскага западозрылі ў “нядобранадзейнасці” і аддалі пад суд у Магілёўскую ваенна-судовую камісію [11, арк. 206]. Суд прысудзіў яго да абкладання маёнтка дзесяціпрацэнтным зборам як маючага дачыненне да паўстання [13, арк. 30], а ў 1864 годзе Ю. С. Рашкоўскі быў звольнены з пасады павятовага маршалка дваранства [14, с. 181].

Адзін дзень згаданага вышэй тэрору красамоўна адлюстраваны ў “Кароткай запісцы аб беспарадках, якія ўспыхнулі сярод сялян мястэчка Букмуйжа Рэжыцкага павета пад уплывам дзеянняў паўстанцаў”, якую напісаў судовы следчы Каржанеўскі: “…У ноч з 15 на 16 красавіка 1863 г. падпаліў невядома хто маёнтак Дагду Дынабургскага павета на мяжы з Рэжыцкім паветам. У гэты час маладыя памешчыкі з маёнтка Навамыслі Кібарты ехалі ў Дагду, але паколькі там сяляне пачалі хапаць памешчыкаў па падазрэнні ў мяцяжы, то Кібарты з’ехалі з дарогі і схаваліся ў лесе. 16 красавіка былі затрыманыя мужыкамі каля Букмуйжы таксама па падазрэнні ў мецяжы: памешчык Кулакоўскі і нейкі землямер, паляк і тры нібыта афіцэры. Пасля гэтага затрымалі памешчыка Сея, які ехаў са стрэльбамі і рэвальверамі, корпіяй і іншым. Нарэшце, 17 красавіка паны ехалі ў трох фурманках, але пасля таго, як іх пачалі праследаваць каравульныя сяляне, яны ўцяклі верхам на конях у лес, кінутыя імі фурманкі былі захопленыя. У іх знайшлі корпію, стрэльбы і порах…

Вестка пра неспакойныя падзеі прывяла да таго, што жыхары наваколля Букмуйжы сабраліся каля карчмы каля 500 чалавек, усе ўзброены былі ў дубіны, стрэльбы і склюды. Гэты натоўп пад кіраўніцтвам пяцісоцкага Данілава арыштаваў трох ксяндзоў, памешчыка Сабанскага, яго паверанага Гацэвіча і кухарку Агату. Памешчык Сабанскі быў 80-гадовым старым, у якога не было ніякіх сваякоў, фізічна ён не мог удзельнічаць у паўстанні. Тым не менш яго сядзібу абшукалі. Падчас вобыску ў памешчыка не знайшлі нічога падазронага, але затое знайшлі буйную суму грошай: 12 450 рублёў і даўгавых распісак на прыблізна такую ж суму. Усе гэтыя грошы зніклі бясследна разам з тымі, хто праводзіў ператрус. Пазней невялікую частку срэбных манет сяляне вярнулі абшарніку. Памешчыка Сабанскага, яго паверанага, кухарку і трох ксяндзоў вырашана было адпусціць з прычыны іх невінаватасці” [8, арк. 3–7].

Як мы бачым, улады ніяк не адрэагавалі на адкрытае рабаванне, у якім вінаватыя былі сялянскія каравулы, таму што яны выконвалі неабходную ў той момант дзейнасць. Сяляне ў большасці выпадкаў хапалі памешчыкаў, якія мелі дачыненне да мяцяжу, везлі ў паўстанцкія атрады зброю, боепрыпасы, перавязачныя матэрыялы. Таму каралі не сялян, а тых, хто на іх скардзіўся, як гэта было з сенненскім правадыром дваранства Ю. С. Рашкоўскім.

Выпадкі, падобныя на той, што адбыўся ў Рэжыцкім павеце, былі характэрныя і для іншых мясцовасцей. Напрыклад, у Дынабургскім павеце па прапанове М. М. Мураўёва, грамадзянскі губернатар В. М. Вяроўкін у лістападзе 1863 года спыніў крымінальную справу аб разрабаванні сялянамі маёмасці памешчыкаў і валасных праўленняў. З-пад арышту былі выпушчаныя рабаўнікі, паколькі, на думку Мураўёва і Вяроўкіна, гэта было не рабаванне, а перaслед сялянамі мяцежнікаў, “якія паднялі зброю супраць законнага ўрада” [7, арк. 19].

У Інфлянцкіх паветах Віцебскай губерніі М. М. Мураўёў загадаў спыніць следчыя справы ў дачыненні да сялян, якія абвінавачваліся ў супраціве памешчыкам і міравым пасрэднікам, паколькі памешчыкі і міравыя пасрэднікі былі “польскага паходжання” і таму складалі несправядлівыя статутныя граматы “спецыяльна для таго, каб дэстабілізаваць абстаноўку ў краі” [7, арк. 3–4].

Акрамя таго, Мураўёў “усклаў увесь цяжар” падводнай і пастойнай павіннасці на гарадскіх жыхароў – памешчыкаў і шляхту “польскага паходжання” (каталікоў), пазбавіўшы ад гэтых павіннасцей сялян [10, арк. 146–147].

Трэба адзначыць, што служба ў сельскіх каравулах па ўзроўні небяспекі ішла ў нагу з ваеннай службай, сярод каравульных сялян былі параненыя і забітыя. Напрыклад, у фальварку Навасёлкі Ігуменскага павета, адбыўся бой з атрадам інсургентаў, у выніку якога сельская варта панесла вялікія страты, было забіта 8 сялян [6, арк. 4].

Такім чынам, з вышэйсказанага бачна, што грамадзянскія і ваенныя ўлады пад кіраўніцтвам генерал-губернатара Мураўёва праводзілі тонка-прадуманую палітыку ў дачыненні да сялянства, дзякуючы якой вельмі нямногія сяляне далучыліся да паўстання 1863–1864 года, значна больш іх прыняло ўдзел у яго падаўленні. Гэтаму спрыяў той фактар, што дзяржава рабіла стаўку на класавую варожасць паміж абшарнікамі і сялянамі. Мы бачым, што дзяржаўная ўлада ва ўсіх спрэчках паміж імі загадзя становіцца на бок сялян. А так сама забяспечвае вясковых вартавых зброяй і паліцэйскімі паўнамоцтвамі, чым дае магчымасць апошнім паліча́ццa за крыўды, якія відавочна мелі месца ў дарэформенны перыяд. Таксама вялікае значэнне вартавых у падаўленні паўстання. У 60 гг. XIX ст. паліцэйская служба яшчэ знаходзілася ў стадыі станаўлення. Кадравых войскаў, накіраваных у Беларусь для падаўлення, бракавала, а тыя, што былі, не мелі магчымасці хутка дабірацца да месцаў, дзе ўзнікала ў іх патрэба, з-за слабога развіцця шляхоў паведамлення. Таму без удзелу сялянскіх варт хутка задушыць паўстанне ўлады не змаглі б.

### Літаратура


1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 519 с.
2. Ігнатоўскі, У. М. 1863 год на Беларусі: нарыс падзей / У. М. Ігнатоўскі. – Менск : Выд. і друк БАН, 1930. – 274 с.
3. Лушчыцкі, І. М. Грамадская думка ў перыяд паўстання 1863 г. Кастусь Каліноўскі / І. М. Лушчыцкі // Нарысы гісторыі філасофскай і сацыялагічнай думкі Беларусі (да 1917 г.) / рэдкал.: К. Буслаў (гл. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1973. – С. 118–133.
4. Музафараў, А. А. 10 міфаў аб Расіі / А. А. Музафараў – М. : Яуза: Эксма, 2012. – 320 с.
5. Ратч, В. Ф. Звесткі аб польскім мяцяжы 1863 года ў Паўночна-Заходняй Расіі: у 2-х т. / В. Ф. Ратч. – Вільня : У друкарні губернскага Праўлення, 1867–1868. – Т. 2.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1541.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31225.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31437.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2001. – Воп. 2. – Спр. 13.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2500. – Воп. 1. – Спр. 24.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2586. – Воп. 1. – Спр. 116.
12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2601. – Воп. 1. – Спр. 2.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 3257. – Воп. 2. – Спр. 2.
14. Памятная кніжка Магілёўскай губерні на 1864 год. – Магілёў на Дняпры : друк. у тып. губ. праўлення,1864. – 378 – V с.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова